# СУЧАСНЫЯ МАДЭЛІ ТРАНСФАРМАЦЫІ ЖУРНАЛІСЦКІХ ЖАНРАЎ

***Г. К. Тычко***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tychko@mail.ru*

У сучаснай журналістыцы прадстаўлены некалькі мадэляў жанравай трансфармацыі, абагульненыя ў навуковых працах маскоўскай і пецярбургскай школ. Беларуская навуковая журналістыка арыентуецца на працы Б. Стральцова. Устойлівымі рысамі жанравай мадэлі даследчыкі прызнаюць: паведамленне, інтэрпрэтацыю, прыёмы эмацыйнага ўздзеяння. Класічнае разуменне жанру як ўстойлівага фармальнага і змястоўнага канону сёння пераасэнсоўваецца. Паняцце «жанр» часта замяняюць тэрмінам «фармат». У групу мастацка-публіцыстычных жанраў уваходзяць новыя, у тым ліку споведзь, эпіграма і інш.

***Ключавыя словы:*** журналістыка; жанр; мадэль; фармальна-змястоўны канон; фармат; эпіграма; споведзь.

# MODERN MODELS OF TRANSFORMATION OF JOURNALISTIC GENRES

***H. K. Tychko***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvaryjskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: H. K. Tychko (tychko@mail.ru)*

Several models of genre transformation are presented in modern journalism, summarized in scientific works of the Moscow and St. Petersburg schools. Belarusian scientific journalism focuses on the works of B. Straltsou. Researchers recognize the following as persistent features of the genre model: message, interpretation, techniques of emotional impact. The classical understanding of the genre as a stable formal and substantive canon is being reinterpreted today. The concept of «genre» is often replaced by the term «format». The group of artistic and journalistic genres includes new ones, including confession, epigram, etc.

***Key words:*** journalism; genre; model; formal-content canon; format; epigram; confession.

Класіфікацыя журналісцкіх жанраў звычайна адбываецца паводле наступных прыкмет: прадмет адлюстравання, прызначэнне матэрыялу, шырыня асвятлення рэчаіснасці і маштабы высноў, выкарыстаныя літаратурна-стылістычныя сродкі і памеры матэрыялу. У канцы мінулага XX ст. працэсы жанраўтварэння замарудзіліся, а сёння адбываецца імклівая трансфармацыя існуючых жанраў. У сучаснай навуцы прадстаўлены некалькі мадэляў трансфармацыі жанраў, абагульненыя ў навуковых працах маскоўскай і санкт-пецярбургскай школ журналістыкі. Найперш гэта працы А. А. Тэртычнага «Жанры перыядычнага друку» (М., 2002) і М. Кіма «Жанры сучаснай журналістыкі» (СПб., 2004). Беларуская навуковая журналістыка арыентуецца на работы Б. Стральцова «Метад і жанр» (Мінск, 2002). Паводле меркавання А. А. Тэртычнага, «пад журналісцкімі жанрамі маюцца на ўвазе ўстойлівыя тыпы публікацый, аб’яднаных змястоўна-фармальнымі прыкметамі» [1, с. 9].

У класіфікацыі, якую прапанаваў Б. В. Стральцоў, жанры адрозніваюцца «па характары аб’екта адлюстравання, маюць канкрэтнае прызначэнне, розны маштаб высноў і абагульненняў, адрозніваюцца па характары моўна-стылістычных сродкаў» [2, с. 17]. Тым не менш класіфікацыя журналісцкіх жанраў пастаянна змяняецца, кожны з даследчыкаў прапануе свой арыгінальны варыянт, які істотна адрозніваецца ад існуючых. Так А. Тэртычны да агульнапрынятай трохузроўневай сістэмы жанравага дзялення (інфармацыйныя, аналітычныя, мастацка-публіцыстычныя жанры) дадае стэрэатып: якаснаму выданню патрэбна паўнавартасная аналітыка, масаваму выданню – міні ці проста кароткая нататка. Рускі літаратуразнаўца і тэатральны крытык Л. Кройчык прапануе сваю класіфікацыю жанраў журналісцкіх тэкстаў, якая ўключае пяць узроўняў:

I. Аператыўна-навінны – нататка.

II. Аператыўна-даследчы – інтэрв’ю, рэпартаж, справаздача.

III. Даследча-навінны – карэспандэнцыя, каментар, калонка, рэцэнзія.

IV. Навукова-даследчы – артыкул, ліст, агляд.

V. Даследча-вобразны / мастацка-публіцыстычны – нарыс, эсэ, фельетон, памфлет [3].

На думку Л. Кройчыка, любая класіфікацыя публіцыстычных тэкстаў абавязкова павінна ўключаць у сябе тры найважнейшыя кампаненты: паведамленне аб навіне ці праблеме, асэнсаванне сітуацыі, эмацыйнае ўздзеянне.

Усе даследчыкі прызнаюць, што сёння галоўная асаблівасць журналісцкага твора – вызваленне ад жанравых рамак, свабоднае чаргаванне дакументальнага, біяграфічнага, публіцыстычнага і мастацкага матэрыялу. Тым не менш, устойлівымі прыкметамі той ці іншай жанравай мадэлі ўсё ж застаюцца прапанаваныя Л. Кройчыкам паведамленне, асэнсаванне, прыёмы эмацыйнага ўздзеяння на аўдыторыю. Натуральна, што кожнаму жанру адпавядаюць пэўныя метады працы з фактамі і іх прадастаўленне. Многія журналісты і пісьменнікі сёння перакананыя, што немагчыма выбраць нейкі канкрэтны жанр і ствараць журналісцкі матэрыял згодна з нарматыўнымі прыкметамі гэтага жанру. Таксама не атрымаецца напісаць матэрыял, а потым структураваць яго пад вызначаны жанр. Такім чынам, класічнае разуменне жанру як устойлівага фармальна-змястоўнага канону сёння падвяргаецца крытычнаму пераасэнсаванню, якое пазначылася яшчэ ў XX ст. у працах М. Бахціна. Невыпадкова на мяжы XX і XXI стст. паняцце «жанр» часта сталі замяняць тэрмінам «фармат», у аснове якога ляжаць не змястоўныя, а фармальныя характарыстыкі. Фармат можа ўключаць элементы розных жанраў. Гэта азначае поўнае ігнараванне выбару сродкаў і спосабаў раскрыцця тэмы, метаду збору інфармацыі, колькасці сабраных фактаў, ступені пранікнення ў рэчаіснасць, уключанасць аўтарскай ацэнкі ў прадмет апісання і г. д. Пацверджаннем можа быць мадыфікацыя аднаго і таго ж паведамлення, узятага з інтэрнэту і адаптаванага для розных платформ. Такі тэкст лёгка трапляе ў фармат і выключае сапраўдную журналісцкую творчасць.

Навукоўцы адзначаюць, што сёння амаль знікла мастацка-публіцыстычная група жанраў: нарыс, фельетон, памфлет. Аднак прыёмы фельетона і памфлета – іронія, дасціпнасць, сцёб, ёрніцтва, сарказм, жаргон – выкарыстоўваюцца ў іншых жанрах. Прызнаючы адміранне класічных мастацка-публіцыстычных жанраў: нарыса, фельетона, памфлета, пародыі і інш., даследчыкі прапаноўваюць уключаць у гэтую жанравую групу новыя. Такія, напрыклад, як легенда, эпіграф, эпітафія, анекдот, жарт, гульня, скандал. І яшчэ «парада», «эпіграф», «жарт», «сатырычны каментар», «прывітанне», «прагноз» і інш., якія ўсё ж маюць

вузкае (аказіянальнае) тэрміналагічнае значэнне і звычайна арганічна ўваходзяць як складнікі у больш буйныя жанравыя блокі.

Сучасныя навукоўцы ў якасці жанра журналістыкі называюць таксама споведзь. Да споведзі адносяцца публікацыі, зместам якіх выступае ўнутраны свет саміх аўтараў. Асноўны метад падрыхтоўкі такіх публікацый – самааналіз. Гэты жанр бярэ свае вытокі ў рэлігіі, мастацкай літаратуры і філасофіі. У сціслым неразвітым выглядзе элементы самааналізу (галоўнай прыкметы споведзі) можна выявіць у розных публікацыях – нататках, карэспандэнцыях, рэцэнзіях, артыкулах і інш., усюды, дзе прысутнічае асабістае «я» журналіста. Аднак у такіх публікацыях самааналіз не з’яўляецца асноўнай мэтай. Калі ж самааналіз перарастае з дапаможнага фактару ў адну з галоўных мэт публікацыі, тады і ўзнікае своеасаблівы і цалкам самастойны жанр – споведзь.

Жаданне «спавядацца» ў прэсе ўзнікае ў многіх людзей – як у ардынарных асоб, так і ў людзей незвычайных. Мэты звароту чалавека са сваёй споведдзю да шырокай публікі (у журналістыцы да масавай аўдыторыі) найчасцей наступныя: растлумачыць незвычайны ўчынак, паказаць прыклад мужнасці і сілы духу, падзяліцца досведам паспяховай кар’еры, зрабіць самарэкламу.

Споведзь можа рэалізавацца ў форме канстатацыі журналістам маналогу самога героя альбо ў форме інтэрв’ю, якое бярэ ў яго журналіст. У другім выпадку ўдзел журналіста можа значна ўплываць на змест тэксту, і ён свядома ці міжволі бярэ на сябе пэўную адказнасць за тое, што паведамляецца. Часам «арганізатар» свядома правакуе свайго героя на спрэчныя і непрадуманыя выказванні. Часта журналісты даюць спаведнікам поўную свабоду ў пераказе розных пікантных падрабязнасцяў асабістага жыцця і г. д., а самі не выказваюць сваіх адносін ў дачыненні да таго, пра што ідзе гаворка. Гэта дазваляе як дыстанцыявацца ад зместу споведзі, так і, карыстаючыся «смажанымі» дэталямі, заваяваць непатрабавальных чытачоў. Часам журналісты тлумачаць сваё маўчанне тым, што прэса, маўляў, мусіць заставацца бесстаронняй. Пры такіх падыходах аўдыторыя выдання можа нават узрастаць за кошт дэградаванай публікі, што, безумоўна, адпавядае медыя, арыентаваным перш за ўсё на камерцыйны поспех.

Выкарыстоўваецца сучаснай журналістыкай і такі жанр, як эпіграма, які раней быў жанрам выключна мастацкай літаратуры. Эпіграма – гэта сатырычная мініяцюра, якая вызначаецца лаканічнасцю формы

і аб’ёму крытыкі. Яна высмейвае пэўны аб’ект, часам – адмоўную з’яву. Часта эпіграма даецца як подпіс да карыкатуры. Часам уключаецца ў тэкст, як, напрыклад, гэты тэкст аўтарства К. Крапівы:

«Однажды, когда писатель был уже совсем стареньким и плохо себя чувствовал, он вышел из комнаты с листком бумаги. “Эпиграмму, – говорит, – написал”. И засмеялся. Вот та эпиграмма:

Як буду я ляжаць ужо
Ў труне,
Закончыўшы зямныя справы,
Ён, заклапочаны, рухавы,
Падскочыць
з мікрафонам да мяне
І скажа: “Цесната, я ледзь прабраўся.
Ну як Вам мітынг спадабаўся?”» [4].

Сатыра – як крытыка рэчаіснасці з мэтай яе паляпшэння і ўдасканалення вельмі папулярная ў сучаснай журналістыцы, таксама як і разнастайныя формы і прыёмы рэфлексіі. Большасць жанраў, якія згадваліся вышэй, перажывуць яшчэ не адну мадыфікацыю, а, магчыма, знікнуць назусім альбо на час, каб потым у абноўленым, трансфармаваным выглядзе адрадзіцца зноў у медыйнай прасторы.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Тертычный А. А.* Жанры периодической печати : учеб. пособие. М.: Аспект Пресс, 2006. 193 с.
2. *Стральцоў Б. В.* Метад і жанр. Асновы творчага майстэрства журналіста : вучэб. дапам. Мінск : БДУ, 2002. 118 с.
3. *Кройчик Л. Е.* Система журналистских жанров // Основы творческой деятельности журналиста: учебник / ред.-сост. С. Г. Корконосенко. СПб., 2000. 131 с.
4. 5 марта – 125 лет со дня рождения Кондрата Крапивы. отметить юбилей писателя-сатирика можно вечером в государственном музее истории белорусской литературы [Электронны рэсурс]. URL: https://www.sb.by/articles/chelovek-kotoryy-smeyalsya-krapiva.html (дата звароту: 23.01 2024).